# Справаздача аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2006 год

Падрыхтавана Бюро Дзяржаўнага дэпартамента ЗША па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы

Вера як асабісты выбар і асноўная свабода ёсць асновай амерыканскага характару, якая сваімі каранямі сыходзіць у бачанне нашай краіны яе бацькамі-заснавальнікамі. Свабода веравызнання з’яўляецца адной з нашых важнейшых свабод з самага зараджэння нашай нацыі і па сённяшні дзень, і рашучасць амерыканцаў адстойваць гэтую свабоду не толькі ў сябе дома, але і па ўсім свеце па-ранейшаму нязменная. Як зазначыла дзяржаўны сакратар Кандаліза Райс: “Для Злучаных Штатаў няма больш фундаментальнага пытання, чым свабода веравызнання і рэлігійнае сумленне. Наша краіна была пабудавана на гэтым фундаменце, які ляжыць у самай аснове дэмакратыі”.

Свабода веравызнання з’яўляецца “першай свабодай” Амерыкі, усталяванай Першай папраўкай нашага Біля аб правах. Аналагічным чынам свабода веравызнання з’яўляецца кутнім каменем універсальных правоў чалавека, бо яна ахоплівае свабоду слова, сходаў і сумлення, якія ўсе разам утвараюць аснову дэмакратычнага кіравання і павагі да чалавека. Па гэтай прычыне ўмацаванне дэмакратыі, якое мы назіраем сёння, ідзе побач з умацаваннем свабоды веравызнання і іншых правоў чалавека. Праваабарончая арганізацыя “Фрыдам хаус”, якая штогод прылічае кожную краіну да канкрэтнай катэгорыі як “свабодную”, “часткова свабодную” або “несвабодную”, зыходзячы пры гэтым з шырокага дыяпазону крытэрыяў, у тым ліку свабоды веравызнання, вызначыла, што ў 1972 годзе, калі арганізацыя ўпершыню абнародавала свае рэйтынгі краін, “свабоднымі” аказаліся сорак чатыры краіны. Да мінулага года гэта лічба дасягнула 89. У сваю чаргу лічба “несвабодных” краін скарацілася з 68 у 1972 годзе да 45 на сённяшні дзень.

Аднак хоць дэмакратыя і павага да асноўных свабод умацавалі свае пазіцыі ў свеце, многія ўрады па-ранейшаму толькі на словах выконваюць свае абавязацельствы ў адпаведнасці з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека і іншымі міжнароднымі пагадненнямі. Урады вялікай колькасці краін адмаўляюцца прызнаваць і абараняць свабоду веравызнання. Некторыя ўрады актыўна працідзейнічаюць рэалізацыі гэтага фундаментальнага права. І ў некаторых краінах у цяперашні час экстрэмісты, што практыкуюць гвалтоўныя метады, эксплуатуюць рэлігію ў імя ідэалогіі нецярпімасці і нянавісці, накіроўваюць свае ўрады супраць тых, хто ўсяго толькі імкнецца выконваць рэлігійныя абрады па загаду свайго сумлення. Падтрымліваючы людзей, якія абгрунтавана патрабуюць свабоды веравызнання, мы цвёрда выступаем супраць тых, хто дзейнічае ад імя ўрадаў ці арганізацый, што, маніпулюючы верай у гвалтоўных мэтах, перашкаджаюць рэалізацыі свабоды чалавека і дэмакратыі.

Штогадовая справаздача аб свабодзе веравызнання ў краінах свету была зацверджана як сродак садзейнічання развіццю і абароне гэтага універсальнага

права. Справаздача ставіць за мэту праліць святло на сітуацыю ў тых частках свету, дзе людзей праследуюць па рэлігійных матывах, і, тым самым, перашкодзіць пашырэнню такой практыкі. Сам працэс, які ляжыць у аснове справаздачы – працэс расследавання і дакументавання парушэнняў і выражэння пратэсту на іх конт – можа садзейнічаць аслабленню парушэнняў. Той факт, што такая вялікая колькасць людзей падвяргаецца збіццю, катаванням і зняволенню ў турмах і пры гэтым захоўвае адданасць сваім вераванням і часам ідзе за іх на смерць, гаворыць пра сілу і трываласць іх веры. “Справаздача аб свабодзе веравызнання ў краінах свету” сведчыць аб гэтай сіле, гаворачы ад імя мільёнаў людзей, якія па-ранейшаму пакутуюць па прычыне сваёй рэлігійнай прыналежнасці, канфесіі або выканання рэлігійных абрадаў.

Гэты даклад з’яўляецца натуральным вынікам гісторыі нашай краіны. Мы заклікаем іншых абараняць і захоўваць тое, што з’яўляецца каштоўным для нас. Наш уласны паслужны спіс у адносінах да гэтай і іншых свабод не ідэальны, тым не менш, нашы недасканаласці не могуць служыць апраўданнем для ўхілення ад задачы прадпрымаць захады для таго, каб зрабіць гэтае універсальнае права рэальнасцю для ўсяго чалавецтва. Мая задача як амбасадара па асобых даручэннях па пытаннях свабоды веравызнання ў краінах свету, які нясе адказнасць як перад прэзідэнтам, так і перад дзяржсакратаром у якасці асноўнага дарадцы па пытаннях прасоўвання свабоды веравызнання па ўсім свеце, складаецца з падтрымкі тых людзей, якія імкнуцца ўмацаваць свабоду веравызнання і змагацца з тымі, хто хацеў бы яе задушыць. Пад маім кіраўніцтвам Упраўленне па справах свабоды веравызнання ў краінах свету ажыццяўляе шырокі спектр мерапрыемстваў, накіраваных на рэалізацыю палітыкі ЗША ў сферы свабоды веравызнання, цесна супрацоўнічаючы з калегамі ў Дзяржаўным дэпартаменце і амбасадах ЗША за мяжой у мэтах выкарыстання ўсяго арсеналу дыпламатычных сродкаў у гэтай вобласці. Шляхам афіцыйных і неафіцыйных двухбаковых перамоў з замежнымі ўрадамі, удзелу ў такіх міжнародных форумах, як Арганізацыя Аб’яднаных Нацый і Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, супрацоўніцтва з праваабарончымі і рэлігійымі недзяржаўнымі арганізацыямі, а таксама сустрэчаў з ахвярамі правапарушэнняў мы распрацоўваем і рэалізуем стратэгію барацьбы з праследаваннем па рэлігійных матывах у любым месцы свету.

Перадаючы Кангрэсу і грамадскай супольнасці гэтую восьмую штогадовую “Справаздачу аб свабодзе веравызнання за 2006 год”, я хачу выразіць сваю ўдзячнасць за цвёрдае і неаслабнае кіраўніцтва прэзідэнта Буша і дзяржсакратара Райс у гэтым пытанні, а таксама за дзвюхпартыйную падтрымку, якую забяспечыў кангрэс. Мы ўсе абавязаны выразіць удзячнасць таксама і тым шматлікім людзям, якія працуюць у недзяржаўных арганізацыях ад імя прыгнечаных.

Станоўчы момант, як паказваюць рэйтынгі “Фрыдам хаус”, палягае ў тым, што мы дабіваемся прагрэсу, калі дзейнічаем разам. Аднак відавочна, што складаныя і сур’ёзныя задачы захоўваюцца. “Па меры таго як Злучаныя Штаты прасоўваюць справу свабоды, - сказаў прэзідэнт Буш, - мы памятаем пра тое, што свабода – гэта не дар Амерыкі свету, а дар Бога ўсім мужчынам і жанчынам у гэтым свеце. Гэта

ісціна накіроўвае нашы высілкі з мэтай дапамагаць людзям паўсюль дабівацца прадстаўлення свабоды веравызнання і пабудаваць лепшую, больш светлую і больш мірную будучыню для ўсіх”.

Менавіта адважным мужчынам, жанчынам і дзецям ва ўсім свеце, якія пакутуюць праз сваю веру, мы і прысвячаем гэтую штогадовую справаздачу. Няхай яна ў нейкай ступені падтрымае іх у іх чаканнях і дасць вядомую надзею на тое, што іх гісторыя яшчэ будзе расказана, а іх цяжкае становішча не будзе забыта пад ціскам неадкладных міравых спраў.

Джон В. Хэнфард, амбасадар па асобых даручэннях па пытаннях свабоды веравызнання ў краінах свету.